Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Валмянскі вучэбна-педагагічны комплекс
дзіцячы сад – базавая школа”
Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці

АДКРЫТЫ ДЫСТАНЦЫЙНЫ КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ МАРАФОН
«ЧАС ВЫМЯРАЕЦЦА ПАМЯЦЦЮ»

*Намінацыя “Гістарычны хранограф”*

**ДАСЛЕДЧАЯ РАБОТА**

**“Касцёл Святога Яна в.Волма і яго роля ў жыцці вёскі, духоўна-маральным выхаванні падрастаючага пакалення”**



Аўтар работы:

Рубанік Наталля Уладзіміраўна, настаўнік беларускай мовы і літаратуры дзяржаўнай установы адукацыі «Валмянскі ВПК ДС - БШ» Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці

Аг.Волма, 2022

# ЗМЕСТ


Уводзіны 3

ГЛАВА 1. Гісторыя храма ў вёсцы Волма 5

ГЛАВА 2. Значэнне валмянскага храма ў жыцці вёскі 12

ГЛАВА 3. Вывучэнне меркавання аб ведах гісторыі храма і яго значэння ў сучасным жыцці вёскі, духоўна-маральным выхаванні падрастаючага пакалення 16

Заключэнне 20

Спіс выкарыстаных крыніц 21

Дадаткі 22

# УВОДЗІНЫ

Гісторыя свайго народа, сваёй краіны заўсёды хвалявала розумы людзей. Кожнае новае пакаленне прыносіць нешта сваё ў развіццё грамадства, краіны. У сваёй працы я правяла даследаванне актуальнай, на мой погляд, тэмы. Вывучэнне дадзенай тэмы прадыктавана не толькі асабістай, але і грамадскай патрэбай аднавіць страчаныя старонкі духоўнай спадчыны вёскі, роднага краю. Без мінулага няма будучыні. Вывучыўшы мноства крыніц, я прыйшла да высновы, што для адраджэння духоўнасці падрастаючага пакалення неабходна, каб дзеці лепш ведалі гісторыю свайго народа. Павага да помнікаў даўніны, беражлівыя адносіны да веры сваіх продкаў - адзін з бакоў маральнай характарыстыкі чалавека. Яна дазваляе маладому пакаленню адчуваць сябе спадчыннікам мінулага і ўсведамляць сваю адказнасць перад будучыняй. Для нас захавалі продкі многае, і важна гэтую нітку не абарваць, працягнуўшы яе ў будучыню. А менавіта перад намі стаіць задача іх аднаўлення.

**Тэма даследчай работы:** "Касцёл Святога Яна в.Волма і яго роля ў жыцці вёскі, духоўна-маральным выхаванні падрастаючага пакалення".

**Мэта работы**: атрыманне гістарычных звестак аб мінулым Валмянскага храма, вызначэнне яго ролі ў жыцці вёскі і ў духоўна-маральным выхаванні падрастаючага пакалення.

Для дасягнення гэтай мэты паставіла **задачы:**

разгледзець літаратуру, навуковыя і дакументальныя крыніцы па дадзенаму пытанню;

адшукаць дакументальныя звесткі аб храме ў вёсцы, вывучыць храналогію падзей, звязаных з яго гісторыяй;

высветліць значэнне храма ў розныя гістарычныя перыяды;

прааналізаваць, якое духоўна-маральнае значэнне мае храм для сучасных жыхароў вёскі.

**Праблема даследавання**: роля храма ў жыцці вёскі.

У ходзе даследчай работы я рашыла праверыць **гіпотэзу**: храм заўсёды з'яўляўся духоўным, маральным, сацыяльным і культурным цэнтрам вёскі, і яго дзейнасць садзейнічае павышэнню ўзроўню маральнага выхавання моладзі.

Пры вывучэнні дадзенай тэмы мною былі выкарыстаны розныя **метады даследавання:** тэарэтычны аналіз і абагульненне навуковай літаратуры, дакументаў архіваў і фондаў музеяў, фотадакументаў; бібліяграфічны аналіз літаратуры і матэрыялаў сеткі Internet; інтэрв'юіраванне пробашча касцёла Святога Яна; сацыялагічнае апытанне вучняў, педагогаў, жыхароў вёскі пра стаўленне да храма і адраджэнне духоўнасці; аналіз і сінтэз атрыманай інфармацыі.

**Навізна** работы ў тым, што хоць у разнастайных даследаваннях былі звесткі пра храм у вёсцы Волма, аднак падрабязнага вывучэння гісторыі храма, аналізу і сінтэзу, абагульнення інфармацыі не рабілася. Упершыню адбываўся пошук уяўленняў аб духоўным патэнцыяле нашай вёскі, духоўна-маральным значэнні храма для сучасных жыхароў вёскі і падрастаючага пакалення.

Выявіўшы праблему і вывучыўшы адпаведную літаратуру, я прыйшла да высновы, што дадзеная тэма **актуальная** ў нашы дні, так як цікавасць да духоўнай, гістарычнай спадчыны - ёсць найважнейшая ўмова паспяховага развіцця Беларусі. Цікавасць да гісторыі малой Радзімы спрыяе ўмацаванню любові да краіны. Чалавек, які ведае свае карані, вырасце сапраўдным чалавекам. Чалавекам, які ў будучыні стане адказным за магутнасць сваёй краіны, за захаванне яе матэрыяльных і духоўных багаццяў.

**Аб'ект даследавання:** хроніка падзей, звязаных з храмам, і працэс духоўна-маральнага выхавання асобы на аснове хрысціянскай этыкі.

**Прадмет даследавання**: уплыў храма на жыццё вёскі і яго жыхароў.

Даследчая работа мае, лічу, **практычнае значэнне**: яна можа быць выкарыстана на ўроках літаратуры, гісторыі, дапаможа ў арганізацыі пазакласных заняткаў, выхаваўчай работы, работы краязнаўчага гуртка, можа служыць матэрыялам для краязнаўчага музея, захавае інфармацыю для жыхароў не толькі вёскі, але і раёна.

**Асноўнымі крыніцамі** для напісання дадзенай работы былі архіўныя дакументы (атрыманыя з Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі), фотадакументы, архівы рэсурсаў сеткі Інтэрнет; дыягнастычныя методыкі, выяўляючыя ўзровень маральнай культуры навучэнцаў.

# ГЛАВА 1
# ГІСТОРЫЯ ХРАМА Ў ВЁСЦЫ ВОЛМА

Першыя звесткі пра храм у вёсцы датычыцца 15 стагоддзя. Згодна гістарычных дакументаў, у 1473 годзе Станіслаў і Барбара Даўкшэвічы заснавалі драўляны касцёл з падараванай зямлёю на 100 мер засеву і 10 падданымі з жонкамі і дзецьмі як рабочых і таксама з правам атрымання плябанам дзесяціны з фальваркавых двароў Волмы і Брацлаў. У 1495 г. Лізавета Андрэеўна Салагубава (уладальніца Івенца) ахвяравала біскупу Віленскаму, калі дакладней – валмянскай парафіі, усе лугі, лагчыны са сваіх земляў, што ёй належалі ў Волме. [7, с.146]

У 1584 годзе касцёл быў фундаваны як парафіяльны княгіняй Агінскай. [4, с.403] Пазней за гэту зямлю быў судовы працэс плябанаў з уласнікамі Валадковічамі. Марцін Валадковіч, суддзя земскі Мінскага ваяводства, паводле выраку (прыгавору суда па крымінальным ці цывільным справам у ВКЛ) духоўнага трыбуналу ад 28 жніўня 1629 г. вярнуў захопленыя землі разам з сялянамі касцёлу. [7, с.144]

Існаваў той касцёл больш за 100 гадоў, пакуль не быў спалены кальвіністамі. Епіскап Віленскі, а затым кардынал Ежы Радзівіл адбудаваў касцёл у 1587 годзе. [11, с.160] Той касцёл таксама згарэў, быў адбудаваны ў 1667 годзе ксяндзом Віктарам Анджыеўскім, пробашчам Волмы. [10, с.103]

У 1655 г. у склад Валмянскай парафіі ўваходзілі места, пляц касцёльны, 72 валокі зямлі. Сам двор плябаніі быў невялікі - 100 квадратных крокаў. Звычайна парафія налічвала 5 тысяч веруючых, большасць якіх перайшло ў каталіцызм па загаду ўлад. З усіх парафій колькасць перайшоўшых тут у каталіцызм было самым вялікім – у дзень прыезду епіскапа Шэмбека адразу перайшло некалькі тысяч насельніцтва.

Чарговы храм пабудаваны ў 1738 годзе па фундацыі памешчыка Ваньковіча з дрэва на старым намоленым месцы. У 1784 годзе ён быў пасвечаны Унебаўзняццю Найсвяцейшай Панны Марыі. Ён меў шэсць алтароў, серабро і шмат іншага богаслужэбнага касцельнага начыння. Пры касцёле існаваў шпіталь на пяць убогіх (хворых). Пад касцёлам была мураваная крыпта. [7, с.145]

Да плябаніі належала юрыдыка (адасобленыя часткі зямель, якія належаць феадалам, царкве і на жыхароў якіх не пашыралася судовая ці адміністрацыйная ўлада) у мястэчку Волма, фальварак Жаброўшчына, 22 валокі зямлі, 49 падданых. Мітрапалічная візіта (наведванне касцёла) каля сярэдзіны 19 ст. адзначала, што даход з фальварка касцёла быў 364 руб. Калі зямлю з падданымі ў касцёле забралі, урад прызначыў плябану індэмнітэт (пакрыццё страт, кампенсацыя) па 275 руб. у год і пакінуў ім 1,5 валокі зямлі. У 1842 г. Валмянская парафія налічвала звыш 6 тыс. вернікаў (прыхаджан). [2, с.42]




*1.1 –Касцёл Унебаўзняцця Найсвяцейшай Панны Марыі. Пачатак 20 ст.*

Касцёл з’яўляўся помнікам драўлянага дойлідства з элементамі барока. У плане ён быў крыжовы, 3-нефавы са слаба развітым трансентам (бакавыя крылы планіровачнага крыжа храма ці папярочны неф базілікі, які павялічвае прастору інтэр’ера малітоўнай залы перад алтаром) і 5-ці граннай апсідай. Фасад быў фланкіраваны дзвюма 2-х яруснымі 4-х граннымі шатровымі вежамі, якія выступалі за межы асноўнага аб’ёму. Дзвярныя і аконныя праёмы мелі гранёную арачную форму і вылучаліся на гарызантальнай шалёўцы фасадаў. [4, с.403] Пры касцёле быў пяцігранны алтарны прыруб. Сцены ў верхняй частцы прарэзаны аконнымі праёмамі з трапецападобнымі ліштвамі (прафіляванне ці арнаментаванае афармленне аконнага ці дзвярнога праёма, перароблены ў другой палове 19 ст.) і гарызантальна ашаляваны. Цокальная, ніжняя частка вонкавай сцяны касцёла, якая ляжала на бутавым фундаменце, была вылучана вертыкальнай шалёўкай. Інтэр’ер трохнефавы, зальнага тыпу. Перакрыццё касцёла было плоскае, бэлечнае з падшыўной столлю, якая ўтварала над бакавымі нефамі шырокія паддугі. Алтарная частка адкрывалася ў асноўнае памяшканне гранёным уверсе праёмам. У прасторы паміж вежамі быў вылучаны вузкі нартэкс з размешчанымі над ім хорамі, якія выступалі ў асноўнае памяшканне касцёла. Алтарная частка касцёла выходзіла ў асноўнае памяшканне шырокім праёмам з укосінамі па верхніх вуглах. Алтар упрыгожвалі тры скульптуры: у цэнтры – Святая Троіца, з левага боку – Божая Маці, з правага боку – Ісуса Хрыста, якія захаваліся да нашага часу. У касцёле знаходзіўся арган, які ў час службы суправаджаў яе велічнай музыкай, якая закранала сэрцы. Спявалі ў касцёльным хоры вясковыя дзяўчаты. [2, с.43]

Драўляны будынак быў пабудаваны без адзінага цвіка, ён меў дзве велічныя башні, якія пазней былі разабраны. Збоку перад храмам стаяла 2-ярусная шатровая зрубна-каркасная званіца. [4, с.403]

І вось што пісаў пра мястэчка Волма, касцёл у ім і фальфарак Волма вядомы беларускі гісторык, этнограф, краязнавец, пісьменнік, перакладчык, публіцыст Аляксандр Карлавіч Ельскі (1834-1916) у шматтомным энцыклапедычным выданні “Геаграфічны слоўнік Каралеўства Польскага і іншых славянскіх краёў” (т.14, на польскай мове):

“Волма – мястэчка і маёнтак над р.Волма (левы прыток Іслачы) Мінскага павета, у 3-й Койданаўскай паліцэйскай акрузе, 25 вёрст ад Койданава, Рубяжэвічскай гміны, парафія каталіцкая, паштовая станцыя Ракаў (14 вёрст),

42 вярсты ад Мінска, у мясцовасці лёгкахвалістай, грунты (землі) пясчаныя, добра родзяць, лугі добрыя.

Да 1866 г. у Волме быў старажытны касцёл парафіі каталіцкай, дэканата Мінскага, з філіяй (філіялам) у Набароўшчыне і Занёўшчыне. Калі ж касцёл быў скасаваны, парафія яго была падзелена паміж суседнімі парафіямі – каменскай (мястэчка Камень) і ракаўскай (мястэчка Ракаў), а ў Волме засталася на могілках капліца з грабамі радаводу Ваньковічаў.” [9, с.853]

У 1867 годзе касцёл быў пераабсталяваны ў праваслаўную царкву, таму што па ініцыятыве ваеннага начальніка Вілейскага павета князя Н.Н.Хаванскага пачалі ажыццяўляцца масавыя звароты каталікоў з дапамогай раздачы казённых зямель. Працэдура далучэння з каталіцтва да праваслаўя насіла толькі юрыдычны характар: выдавалася толькі падпіска з абавязацельствам спавядаць праваслаўную веру. Па заўвазе аднаго з мясцовых чыноўнікаў: “Праваслаўнае духавенства атрымала гэтыя прыходы з рук свецкай улады толькі на паперы”.

Рымска-каталіцкія прыхаджане Валмянскага касцёла былі далучаны да праваслаўя ў 1866 г. сумеснымі намаганнямі мясцовага благачыннага, які звярнуўся за дапамогай да міравога пасрэдніка і ваеннага начальніка павета. У Волму прыбылі спраўнік Багдановіч, асэсар Ілахаў з Ракава, поп і дзве сотні казакоў. Старэйшына вёскі дыктаваў прозвішчы сялян, якія паслядоўна запісваліся. Пасля пачаліся ўгаворы: прыхаджанам абяцалі, што, калі яны пяройдуць у праваслаўе, то не будуць плаціць налогі. Але згадзіліся не многія. Сялянам далі час на роздумы: адны суткі. На наступны дзень былі прызваны казакі, нязгодных былі нагайкамі і раздзетымі саджалі ў лядоўню. Нарэшце камісія зрабіла сваю работу, касцёл быў перададзены пад царкву, прыход скасаваны, а веруючыя пераведзены ў праваслаўе. Для падтрымання парадку ў Волме і суседніх вёсках былі пакінуты казакі. [8], [ Дадатак 3]

Аднак ужо ў 1868 г. прыкладна з 1300 далучыўшыхся да праваслаўя ўдзел у службах царквы прыняло ўсяго 126 чалавек. [2, с.42]

Свята-Успенская праваслаўная царква стала ўваходзіць у Мінскі павет у другую благачынніцкую акругу.

З даведніка “Описание церквей и приходов Минской епархии, составленное по официальным затребованиям от причтов сведениям” (Приложение к “Минским Епархиальным Ведомостям” за 1878 год. Минск, 1878) стала вядома:




*1.2 – “Описание церквей и приходов Минской епархии за 1878 год”*

“Царква мела форму прадаўгаватага крыжа з трыма круглымі глухімі купаламі, з аднымі ўваходнымі дзвярыма, адным радам вакон і гонтавым дахам. Увогуле са знешняга выгляду царква гэта вельмі трухлявая, старая. Унутранае памяшканне царквы мае плошчу каля 35 квадратных сажняў (сажань – 194,8 см). Столь і падлога з дошак; для абпальвання царква не прыстасавана. Іканастас новага

ўстройства, пафарбаваны ў белы колер, з пазалочанымі карнізамі, рамамі (ківотамі) і разьбою складаецца з 15 “нового письма” абразоў, размешчанных у тры ярусы.”

Акрамя гэтага маюцца абразы:

1. Месцапачытаемая ікона Боскай Маці, якая намалявана стаячай на Луне, а ўверсе мае вянок, які як бы трымае святая Тройца. Абраз гэты, велічынёю ў два аршына (1 аршын – 71 см), пісаны на дошцы. На абразе сама выява Боскай Маці і лікі святой Тройцы пакрыты сярэбранай нізкапробнай рызаю. Асаблівых легенд і паданняў пра гэты абраз не захавалася.

2. Абраз Боскай Маці, велічынёю ў 12 вяршкоў (вяршок – 4,4 см), пісаны на дошцы і абкладзены сярэбранай рамкай – дар ад шчадрот яго імператарскай вялікасці расійскага імператара Аляксандра II (1818 - 1881), прысланы ў гэтую царкву ў 1870 г. з нагоды пераўтварэння яе з рымска-каталіцкага касцёла.

Сярэбраны прыбор літургічных сасудаў вагою каля 2 фунтаў (фунт – 409,5 г), а таксама іншыя ўтварныя рэчы з апліку, за выключэннем купелі для хрышчэння дзяцей, ёсць.

Святарскага адзення ёсць пяць, але і тыя не вельмі дарагія, пацёртыя (старыя). Евангеляў богаслужэбных два: адно ў ліст, другое ў ½ ліста, абодва ў пераплёце, абкладзеным малінавым аксамітам, з бронзавымі пазалочанымі ўпрыгожаннямі; іншых богаслужэбных кніг ёсць поўны круг (набор). Царкоўны архіў, толькі нядаўна створаны, мае метрычныя кнігі і спісы прыхаджан толькі з 1867 г., гэта значыць з часу заснавання валмянскага праваслаўнага прыходу. Пагост царкоўны абгароджаны простым плотам з драўляных калоў. Званіца пабудавана асобна ад царквы, у ёй маецца 5 званоў вагою ў 2,5; 1,5; 1 пуд, 30 і 30 фунтаў. У валмянскім прыходзе маецца 5 могілкаў і адна ў вёсцы Глушынцы царква на могілках.

З малітаслоўяў найбольш развіты: правядзенне хрэсных ходаў па паселішчах парафіі, служэнне “по временам заздравных и заупокойных литургий” і запрашэнне святара для асвячэння сваіх хат.” [5, с.53], [Дадатак 4]

Пры Свята-Успенскай праваслаўнай царкве па штату патрэбны святар і псаломшчык. Святаром з 1875 г. працуе Канстанцін Навіцкі, які закончыў курс Мінскай духоўнай семінарыі. Выконвае абавязкі псаломшчыка Мікалай Радзівіновіч, пры пасадзе з 1867 г.

Царкоўнага даходу на працягу года паступае не больш чым 30 руб. Прычт, акрамя штатнага жалавання, карыстаецца царкоўным памяшканнем і зямельным участкам, які складаецца з 2 дзесяцін сядзібнай зямлі, 36 пашы, 12 сенажаці і 2 дзесяцін лесу. Царкоўная зямля размешчана ў двух участках, з якіх адзін знаходзіцца каля самога мястэчка Волма, а другі крыху далей. План на царкоўную зямлю ёсць. Сядзіба прычта размешчана пры царкве, з пабудоў маецца дом святара, амбар, сенавал, стайня, вазоўня і тры хлявы для свойскай жывёлы. Усе гэтыя пабудовы маюць патрэбу ў капітальным і неадкладным рамонце; зрэшты, паводле праведзенага камісіяй агляду, зроблены высновы аб рамонце гэтых пабудоў і ўзвядзенні новага збожжавага гумна для святара і ўсіх

пабудоў для прычта. У прыходзе існуе царкоўна-прыходскае апякунства і адно штатнае народнае вучылішча; пісьменнасць паміж прыхажанамі складае каля 10%. Прыход багадзельні не мае. [5, с.54], [Дадатак 4]

Паводле “Памятной книжки Минской губернии на 1885 год” (Мн., 1884) мястэчка Волма ўваходзіла ў 2-ю акругу, дзе быў благачынным святар Іосіф Гарбацэвіч. [6, с.94]

У Волме ў 1886 г. была царква ў імя Успення Боскай Маці, драўляная, патрабуе “капитальной ремонтировки”. У склад прыходу, акрамя мястэчка Волма, уваходзіць 57 засценкаў. Прыхаджан 1228 мужчын, 1177 жанчын. Святар Іосіф Гарбацэвіч, закончыў Мінскую духоўную семінарыю, служыць з 1878 г., святаром у Волме з 25 сакавіка 1881 г. Выконвае абавязкі псаломшчыка Сямён Фалевіч, скончыў Мінскае духоўнае вучылішча, псаломшчыкам служыць з 1876 г.



*1.3 - Валмянская царква Мінскага павета. Фотаздымак Блазункевіча. Пачатак 20 ст.*

Дамы і гаспадарчыя пабудовы патрабуюць “капитальной ремонтировки”. Зямлі сядзібнай 2 дзесяціны, пашы 36, сенажаці 12 дзесяцін, лесу 2 дзесяціны. У мястэчку Волма – сельская прыходская школа, адкрыта ў 1864 г., месціцца ў грамадскім доме. Усяго вучняў 13 (10 хлопчыкаў і 3 дзяўчынкі). [2, с.45]

У “Памятной книжке Минской епархии 1901 год. Составил А.Товаров” (Мн., 1900) пра праваслаўную царкву ў мястэчку Волма паведамляецца наступнае:

“Мястэчка Волма. Царква Успенская драўляная, пабудаваная ў 1738 г.. Склад прыходу: мястэчка Волма і 56 засценкаў; прыхажан 1599 мужчын, 1510 жанчын. Царкоўнай зямлі 62 дзесяціны 1200 квадратных сажняў. Прычтавыя пабудовы для святара трухлявыя, з 1901 г. будуць узводзіцца новыя.

Прычт: святар Ксенафонт Буякоўскі, студэнт Мінскай духоўнай семінарыі, святаром з 1878 г.; псаломшчык дыякан Феадор Навіцкі, навучаўся прычтавым прадметам (навукам) у Гродненскім праваслаўным манастыры. Паштовы адрас: станцыя Ракаў.” [2, с.46] (Дарэчы дыякан Феадор Навіцкі – гэта бацька вядомага беларускага вучонага Яўхіма Карскага.)

У 1907 годзе ў маёнтку Ванькові чаў з’явілася доўгачаканая капліца.

У 1911 годзе ў Вялікі пост тут пасяліўся першы пробашч, ксёндз Замойтак у Швабоўшчыне. Першым ксяндзом у Волме ў пач. XX ст. быў Мілевіч. Ён пабудаваў



*1.4 – Плябанія. Фотаздымак 1992 года*

плябанію, але яшчэ не было дазволу на парафію. Раней упамянутая капліца ў маёнтку Ваньковічаў замяняла тым часам касцёл, а людзі вымушаны былі з-за адсутнасці касцёла ў Волме наведваць суседнія парафіі.

Маецца таксама капліца ў Кавальцах Святога Роха, пабудаваная ў памяць аб пазбаўленні ад халеры. Тут у 1912 годзе адбыўся першы фэст, на які прыйшло вельмі шмат людзей. Парафіяне Волмы - у большасці сваёй сяляне. [Дадатак 1]

Царква праіснавала да 1917 года, аб чым сведчыць гістарычны дакумент, падпісаны Керанскім (прашэнне вернікаў вёскі Волма аб перадачы будынка царквы пад касцёл). Дарэчы, гэты дакумент нядаўна бачыў на свае вочы былы выпускнік Валмянскай сярэдняй школы, цяпер кандытат гістарычных навук Рудовіч Станіслаў Сцяпанавіч.


SPIS
KOŚCIOŁÓW I DUCHOWIEŃSTWA
DIECEZJI PIŃSKIEJ
w R. P. 1933 i 1934.
PIŃSK – 1933

1.5 – “Spis kosciolow i duchowienstwa diecezjii Pinskiej w r.p. 1933 i 1934”

У 1918 годзе, адпаведна кнізе “Spis kosciolow i duchowienstwa diecezjii Pinskiej w r.p. 1933 і 1934”, царква была перададзена і пераабсталявана пад касцёл. [10, с.103]

У 1921 г. мястэчка Волма ўвайшло ў склад Польшчы. Пачалася актыўная паланізацыя і акаталічванне краю з боку польскіх улад і польскага каталіцкага касцёла. У недалёкім мінулым, калі так можна сказаць, карэнныя католікі – жыхары Валмянскага краю – пачалі з праваслаўя пераходзіць у каталіцызм.

На 1933 год у Валмянскай парафіі налічвалася 2150 прыхаджан. [10, с.103], [ Дадатак 2]

У час Вялікай Айчыннай вайны, у 1942 годзе, у касцёл былі сагнаны некалькі дзясяткаў жыхароў вёскі, па адных звестках, вяскоўцаў хацелі спаліць, але настаўніца, якая ведала нямецкую мову, змагла дамовіцца, і людзі выжылі. Па другой версіі, немцы сагналі людзей у будынак каля касцёла, трымалі іх там тры ночы. На чацвёртую ноч ксёндз Юзаф Цвірка выламаў дзверы і завеў ахвяр у скляпенні касцела, дзе хавалі ксяндзоў і служачых храма. Немцы не спалілі драўляны касцёл. А чаму? Гэта таямніца засталася неразгаданай.

У 1947 годзе Юзаф Цвірка выехаў у Польшчу і касцёл застаўся без ксяндза. Ключ і галоўны крыж былі аддадзены веруючым людзям. У 50-ыя гады ўлада выламала дзверы касцёла і ўсе рэчы былі вывезены ў Івянец. Вернікі ўратавалі два абразы: Святога Роха і Постаць Святога Яна (Сэрца Пана Езуса). [1]



1.6 – Касцёл у савецкі час

У 60-ыя гады па ўказанні зверху мясцовыя ўлады знеслі дзве вежы касцёла, зраўнялі дах і зрабілі ў касцёле спартыўную залу Валмянскай сярэдняй школы, у 70-ыя гады ў будынку зрабілі калгасны зернесклад. У 80-ыя гады быў здзейснены апошні акт вандалізму – касцёл, помнік архітэктуры 18 стагоддзя, быў разабраны. З часткі камянёў фундаменту зрабілі аснову для клумбы. Некаторы час на месцы касцёла была танцпляцоўка. Вернікі заявілі пратэст, і на яе месцы была зроблена часовая капліца.



*1.7 – Рэшткі муроў касцёла*

Каталікі ў 90-ыя гады дабіліся дазволу прыстасаваць пад касцёл частку будынка Валмянскай школы, а на мурах касцёла ў святы праводзіліся багаслужэнні, шэсці. Сёння на месцы касцёла пабудаваны новы велічны будынак. Летам 2000 года пачаліся будаўнічыя работы. У 2001 годзе вялікі гонар быў аказаны парафіянам касцёла Святога Роха – на асвячэнне новага касцёла прыязджаў Кардынал Казімір Свёнтак. Гэта падзея ўзрушыла сэрцы і пачуцці ўсіх жыхароў Волмы, навакольных вёсак, жыхароў раёна.



*1.8 – Выгляд сучаснага касцёла Святога Яна і плябаніі. Фотаздымак 2017 года*

Плябанія ж у 1944 годзе была аддадзена пад Валмянскую сярэднюю школу, якая размяшчалася ў ёй да 1991 года. Пазней, калі быў пабудаваны новы касцёл Святога Яна, ксёндз Уладзімір зрабіў капітальны рамонт плябаніі, і яна стала выкарыстоўвацца па свайму прамому назначэнню – дом для ксяндза. На жаль, у снежні 2018 года плябанія была страчана ў выніку пажара.

Чалавек жыве ў свеце, напоўненага злом, сквапнасцю, зайдрасцю, страхам перад будучым. Ачышчэнне душы ён атрымлівае ў храме прыроды і ў божым храме. Не важна, каму пакланяецца чалавек – прыроднаму бажаству-валуну, або іконе, важна, каб чалавек памятаў, што ён частка прыроды, яе параджэнне, што кожны з нас павінен любіць бліжняга і наваколле вакол сябе, каб жылі мы і нашы нашчадкі.



*1.9 – Выгляд на касцёл і плябанію з вышыні птушынага палёту*

# ГЛАВА 2
# ЗНАЧЭННЕ ВАЛМЯНСКАГА ХРАМА Ў ЖЫЦЦІ ВЁСКІ

У розныя перыяды гістарычнага часу Валмянскі храм у вёсцы меў вялікае значэнне. Ён быў цэнтрам духоўнага, грамадскага, культурнага жыцця. У дарэвалюцыйны перыяд наяўнасць царквы вызначала статус населенага пункта (мястэчка). Самыя галоўныя вехі ў жыцці чалавека: яго нараджэнне, хрышчэнне, шлюб, смерць – афіцыйна фіксаваліся ў храме. Святар ведаў жыццё любой сям'і і быў сілай прыміраючай. Стаўленне да храма, наведвання набажэнстваў было паважлівым, абавязковым.

Акрамя таго, прыход ажыццяўляў яшчэ і адукацыйную функцыю. Першай школай для дзяцей была царкоўна-прыходская школа пры храме. У той час для многіх вяскоўцаў яна была адзінай крыніцай пісьменнасці, цэнтрам маральнага выхавання моладзі, месцам, дзе фарміраваліся нормы светапогляду і паводзін.

У мястэчку Волма сельская прыходская школа адкрыта ў 1864 г., месцілася ў грамадскім доме. Усяго вучняў 13 (10 хлопчыкаў і 3 дзяўчынкі). [2, с.45]

З даведніка "Описание церквей и приходов Минской епархии, составленное по официальным затребованиям от причтов сведениям" (Приложение к "Минским Епархиальным Ведомостям" за 1878 год. Минск, 1878) стала вядома: "У прыходзе існуе царкоўна-прыходскае апякунства і адно штатнае народнае вучылішча; пісьменнасць паміж прыхажанамі складае каля 10%. Прыход багадзельні не мае". [5, с.54], [Дадатак 4]

У школьным музеі знаходзіцца дакумент, атрыманы з Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, у якім змешчана інфармацыя аб тым, што "ў архіўным фондзе "Минское губернское по крестьянским делам присутствие" ў ведамасцях аб вучылішчах і школах па Мінскаму павету за 1867 год значыцца Валмянская пачатковая школа, у якой навучалася 57 вучняў". [1], [Дадатак 5] Акрамя таго дасланы рапарт ад 23 студзеня 1883 года інспектара Мінскай Дырэкцыі народных вучылішчаў, які праводзіў рэвізію Валмянскага вучылішча: "Перш за ўсё выпрабоўваліся ўсе тры выдатніцы па Закону Божаму. У І аддз. пыталіся патрабаванні малітвы з кароткімі тлумачэннямі, па жыцці Святой Троіцы, у ІІ – пераказ падзей са святой гісторыі Новага запавета… Затым пасля пятнаццаціхвіліннага антракта вучні пад маім кіраўніцтвам пелі святыя песні…" [1], [Дадатак 6]

Выхаванне маральнасці, культуры, у тым ліку і этычных нормаў, ішло і праз рэлігійныя святы. У мястэчка падчас службаў і царкоўных святаў сцякаліся жыхары парафіі з усіх навакольных вёсак, якія знаходзіліся часам даволі далёка. З даведніка "Описание церквей и приходов Минской епархии, составленное по официальным затребованиям от причтов сведениям" (за 1878 год) дазнаёмся: "З малітаслоўяў найбольш развіты: правядзенне хрэсных ходаў па паселішчах парафіі, служэнне "по временам заздравных и заупокойных литургий" і запрашэнне святара для асвячэння сваіх хат." [5, с.53], [ Дадатак 4]



*2.1. – Да першай споведзі. Сям'я Маеўскіх з в. Хімарады. Фотаздымак 1934 г.*

Асабліва паважаным, па ўспамінах старажылаў, было прастольнае свята ў гонар Святога Роха. На свята з'язджаліся госці з навакольных вёсак. У храме ішла ўрачыстая служба, гарэла мноства свечак, было адчуванне радасці, абнаўлення. Пасля службы весяліліся ўсім мястэчкам, але п'яных не было. [1], [Дадатак 9]

Самае светлае свята - Вялікдзень, да якога доўга рыхтаваліся. А ў само свята ў кожным доме - велікодныя кулічы, лепшыя з іх неслі ў храм.

Неацэнная роля касцёла Святога Яна ў сучасным жыцці, асабліва гэта тычыцца выхавання падрастаючага пакалення. Храм выконвае асветніцкую ролю, знаёміць з хрысціянскай культурай і яе традыцыямі, накіроўвае асобу ажыццяўляць сваю дзейнасць у рамках маральных каштоўнасцяў, а гэта так неабходна ў нашым сучасным свеце.

Дарослыя людзі, якія жадаюць даведацца пра хрысціянства, могуць прыходзіць на гутаркі, якія ксёндз, пробащ касцёла Святога Яна праводзіць кожную нядзелю. У храме праходзяць нядзельныя службы, абрады. Больш за ўсё вернікаў у храме бывае на святы Каляды, Хрышчэнне, Вялікдзень, Сёмуху, Святога Роха. Дзеці вернікаў удзельнічаюць ва ўсіх святах, рыхтуюць касцюміраваныя паказы, спяваюць песні, чытаюць вершы. Дарослыя з задавальненнем наведваюць гэтыя канцэрты, ладзяць для дзяцей трапезу, дораць падарункі.

Настаяцель храма пробашч касцёла Святога Яна ксёндз Валянцін падзяліўся з інфармацыяй аб тым, якія абрады і ў якой колькасці былі праведзены за апошнія тры гады. Аналіз дадзеных паказаў, што часцей за ўсё да ксяндза звяртаюцца з просьбай аб заздраўных і памінальных імшах, другі па значнасці абрад - абрад адпявання. І зусім мала выпадкаў звароту за абрадам вянчання. Таксама ксёндз Валянцін распавёў, якія



*2.2. – Пробашч касцёла Святога Яна ксёндз Валянцін у час набажэнства*

службы і святы найбольш наведвальныя. Дадзеныя згрупавалі ў выглядзе дыяграмы “Выпадкі звароту ў Валмянскі храм”.

*Дыяграма 2.3. "Выпадкі звароту ў Валмянскі храм"*




У той жа час я правяла апытанне сярод педагогаў, жыхароў вёскі і вучняў школы (32 апытаных) аб тым, на якія хрысціянскія святы яны наведваюць касцёл Святога Яна і якія традыцыйна святкуюць у сваіх сем’ях. Найбольш часта службы ў касцёле наведваюць на Вялікдзень (27 рэспандэнтаў), Каляды (26), Дзень памяці ўсіх памерлых(25), Яна Хрысціцеля (21), Святога Роха (16) і інш. Вынікі апытання паказаны ў дыяграме:

*Дыяграма 2.4. "Святы, на якія найбольш часта наведваюць касцёл"*





*2.3. – Карціна “Касцёл Святога Яна”. Мастак Валента Ігар Мітрафанавіч, член Саюза мастакоў Рэспублікі Беларусь, настаўнік Валмянскага ВПК*

Таксама помнікі гісторыі і культуры для жыхароў нашай вёскі з’яўляюцца крыніцай натхнення для стварэння твораў мастацтва. У сваіх карцінах мясцовыя мастакі перадаюць любоў да роднага края, вучаць бачыць прыгожае ў, здаецца, звыклых для погляда краявідах. На карцінах маіх землякоў можна ўбачыць наш храм і сонечнай вясной, і буйназялёным летам, і маляўнічай залатой восенню. [Дадатак 7]

Такім чынам, значэнне храма не вычэрпваецца толькі роляй рэлігійнага цэнтра. Усё жыццё селяніна, ад нараджэння да смерці, звязана было з парафіяльным храмам - у ім яго хрысцілі, тут ён прычашчаўся, браў шлюб. Гэта было месца, дзе селянін атрымоўваў пачатковую адукацыю. Таксама – гэта культурны цэнтр вёскі.

## ГЛАВА 3
## ВЫВУЧЭННЕ МЕРКАВАННЯ АБ ВЕДАХ ГІСТОРЫІ ХРАМА І ЯГО ЗНАЧЭННЯ Ў СУЧАСНЫМ ЖЫЦЦІ ВЁСКІ, ДУХОЎНА-МАРАЛЬНЫМ ВЫХАВАННІ ПАДРАСТАЮЧАГА ПАКАЛЕННЯ

Каб даведацца пра тое, ці ведаюць дзеці гісторыю свайго храма, а таксама выявіць стаўленне да значэння храма для жыхароў, былі праведзены анкетныя апытанні навучэнцаў, педагогаў, жыхароў вёскі.

Анкетаванне было накіравана на вывучэнне грамадскай думкі па наступных напрамках:

1. Выявіць веданне гісторыі храма ў в. Волма;
2. Выявіць жаданне больш даведацца пра гісторыю нашага храма;
3. Выявіць, ці аказвае ўплыў на жыхароў храм у нашай вёсцы.

У ходзе даследавання было апытана 10 вучняў установы адукацыі (ва ўзросце 10 – 14 гадоў), 10 педагогаў і 12 жыхароў вёскі - прыхаджан касцёла Святога Яна.

У выніку апытання высветлілася, што рэспандэнты ведаюць гісторыю касцёла Святога Яна не ў поўным аб’ёме.

*Дыяграма 3.1. Ці ведаеце вы гісторыю нашага храма?*




Наступным задавалася пытанне: “Ці хацелі вы даведацца больш пра храм в.Волма, калі б такая інфармацыя была ў даступнай форме?”

Высветлілася, што 80 % апытаных навучэнцаў, 80 % педагогаў, 100 % жыхароў вёскі хацелі б больш падрабязна даведацца пра гісторыю храма роднай вёскі. У выніку была выяўлена цікавасць з боку вучняў, педагогаў, аднавяскоўцаў да тэмы маёй даследчай работы і была выяўлена яе практычная значнасць.

*Дыяграма 2. Меркаванне вучняў*




*Меркаванне педагогаў*




*Меркаванне жыхароў вёскі*



Таксама высвятлялася інфармацыя, ці з'яўляецца традыцыяй сям'і рэспандэнта святкаванне хрысціянскіх святаў:

а) так, гэта традыцыя нашай сям'і,

б) раней мы не надавалі ўвагі гэтым святам, тым не менш, у апошні час гэта становіцца традыцыяй нашай сям'і,

в) мы не святкуем гэтыя святы,

г) іншы адказ.

Дыяграма 3.3










Па выніках наступнага пытання мною ўстаноўлена, што 70% апытаных вучняў, 60% педагогаў, 57% жыхароў вёскі лічаць, што калі людзі наведваюць храм, то яны змяняюцца да лепшага, становяцца добрымі і выхаванымі. Значыць наведванне храма ўсё ж такі дапамагае выхоўваць добрых і годных людзей.

Дыяграма 3.4




*Пытанне 4:*
*Як вы лічыце, калі людзі ходзяць у царкву, яны становяцца больш добрымі і выхаванымі?*

На пытанне аб маральным, духоўным, выхаваўчым уплыве храма на жыхароў вёскі 57% апытаных упэўненыя ў гэтым уплыве, 26% не ведаюць і 17% думаюць, што не мае. Большасць адзначыла вялікую ролю храма для жыхароў нашай вёскі. Такім чынам, я магу адзначыць, што сучаснае грамадства ўсведамляе значэнне і важнасць касцёла (царквы) ў гісторыі вёскі і, значыць, дзяржавы. Магчыма, калі большая колькасць людзей будзе наведваць храм, то жыхары вёскі стануць больш маральнымі і духоўнымі.




*Пытанне 5:*
*Ці аказвае храм якое-небудзь уздзеянне (маральнае, духоўнае, выхаваўчае) на жыхароў нашай вёскі?*

Акрамя гэтага рэспандэнтам была прапанавана дыягностыка “Адносіны да жыццёвых каштоўнасцяў”, мэтай якой было вызначыць адносіны да духоўных каштоўнасцяў і матэрыяльных благаў.

Інструкцыя: “Уявіце, што ў вас ёсць чароўная палачка і спіс з дзесяці жаданняў, выбраць з якіх можна толькі пяць”.

Спіс жаданняў:
1. Быць чалавекам, якога любяць.
2. Мець шмат грошай.
3. Мець самы сучасны камп’ютар (тэлевізар, аўтамабіль і г.д.).
4. Мець вернага сябра.
5. Мне важна здароўе бацькоў.
6. Мець магчымасць многімі камандаваць.
7. Мець шмат слуг і імі распараджацца.
8. Мець добрае сэрца.
9. Умець спачуваць і дапамагаць іншым людзям.
10. Мець тое, чаго ў іншых ніколі не будзе.

Інтэрпрэтацыя: нумары адмоўных адказаў: №№ 2, 3, 6, 7, 10.




У выніку стала відавочна, што большасць апытаных аддаюць перавагу такім жаданням, як быць чалавекам, якога любяць; мець вернага сябра; мне важна здароўе бацькоў; мець добрае сэрца; умець спачуваць і дапамагаць іншым людзям. Ва ўяўленнях дзяцей аб галоўных чалавечых каштоўнасцях назіраецца станоўчая дынаміка. Духоўныя каштоўнасці пераважаюць над

матэрыяльнымі запатрабаваннямі. Найбольш высокія духоўныя якасці вылучаюцца ў вернікаў – прыхажан касцёла Святога Яна.

Нарэшце, вызначалася, як адносяцца педагогі і жыхары вёскі да вывучэння гісторыі і культуры рэлігіі:

а) вывучэнне гісторыі і культуры рэлігіі трэба для агульнага развіцця, пашырэння кругагляду, далучэння дзіцяці да гісторыі і культуры свайго народа;

б) вывучэнне гісторыі і культуры рэлігіі спрыяе духоўнаму развіццю, маральнаму выхаванню моладзі;

в) палепшыцца становішча ў маладзёжным асяроддзі (будзе менш крыміналу, п'янства, наркаманіі);

г) гэта дапаможа выхаванню памяркоўнасці;

д) гэта дапаможа дзецям вызначыць сваё стаўленне да рэлігіі;

е) цяпер модна быць далучанымі да рэлігіі;

ё) гэта прывядзе да ўзмацнення ўплыву рэлігійных арганізацый у грамадстве, што супярэчыць прынцыпу свецкай дзяржавы, роўнасці ўсіх рэлігій і свабоды сумлення.




Можна адзначыць, што рэспандэнты звярнулі ўвагу на ўплыў храма ў вёсцы на агульнае развіццё моладзі, на яе духоўнае выхаванне, на накіраванне падрастаючага пакалення ў неабходнасці здаровага ладу жыцця.

Жыццё чалавека можа будавацца не толькі згодна свецкага, але і праваслаўнага календара. Выкарыстанне нацыянальнай культуры, заснаванай на рэлігійных каштоўнасцях, фарміруе ў дзяцей хрысціянскае стаўленне да бацькоў, блізкіх, роднага края, прыроды, Радзімы. Ніхто не можа прымусіць дзіця верыць ці забараніць пазнаваць асновы рэлігіі. Толькі па жаданні бацькоў дзіця мае права вывучаць ці не вывучаць рэлігію. Уклад жыцця дзіцяці, арганізаваны ў сям'і, мае патрэбу ў падтрымцы і духоўным насычэнні.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

